# ІНСТЫТУТ ГРАМАДСКАГА АБВІНАВАЧВАННЯ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XX СТАГОДДЗЯ

**Г. А. Корабава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*corobova.anuta@gmail.com;*
*навук. кір. — Л. Л. Голубева, канд. юрыд. навук, дацэнт*

У артыкуле разглядаецца зараджэнне інстытута грамадскага абвінавачвання ў першай палове XX ст., яго заканадаўчае замацаванне і змены, якія адбываліся ў прававым статусе грамадскіх абвінаваўцаў на працягу гэтага перыяду да літаральнага знікнення інстытута грамадскага абвінавачвання і яго прычыны. Таксама аналізуецца роля грамадскага абвінавачвання ў жыцці савецкага грамадства. Вылучаны некалькі прычын знікнення інстытута грамадскага абвінавачвання: адсутнасць у СССР антаганізму паміж дзяржавай і грамадствам, узмацненне ролі пракуратуры; адзяржаўленне грамадскага абвінавачвання і ўплыў культу асобы Сталіна на ўсю дзяржаўную і грамадскую сферу жыцця краіны, у выніку чаго грамадства было адхілена ад кіравання краінай.

***Ключавыя словы***: абвінавачванне, грамадскае абвінавачванне, крымінальны працэс.

Адразу пасля перамогі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі перад маладой савецкай краінай паўстала задача цалкам скасаваць буржуазна-памешчыцкую сістэму, таму былі скасаваны ўсе органы царскай юстыцыі. Звергнутыя эксплуататарскія класы ўсімі магчымымі сродкамі спрабавалі перашкодзіць будаўніцтву новага грамадства, таму актывізавалася крымінальная дзейнасць дэкласаваных элементаў, што выклікала неабходнасць стварэння новай судовай сістэмы. У. І. Ленін характарызаваў суды як органы дзяржаўнай улады, а судовую дзейнасць як функцыю дзяржавы. Найважнейшым пачаткам дзяржаўнага, а ў тым ліку і судовага будаўніцтва, У. І. Ленін лічыў удзел працоўных у кіраўніцтве дзяржавай [1, с.45].

Да выдання першага дэкрэта аб судзе ў Выбаргскім раёне Петраграда стаў працаваць суд, дзе першай разглядалася справа салдата-міліцыянера Бяляева, які ў стане ап’янення страляў з вінтоўкі. Пасля звароту старшыні да публікі наконт жадаючых выступіць у якасці абвінаваўцаў і працяглай паўзы двое гледачоў з залывыступіліз прамовай пра шкоду, да якой звычайна прыводзяць падобныя паводзіны і да яе небяспекі ў такі час, што абумоўлівае патрэбнае пакаранне для абвінавачанага. Такім чынам, удзел звычайных людзейу судовых пасяджэннях з самага пачатку быў прыняты грамадствам, як права, якое не падлягала сумненню [7, с. 59].

Першым дэкрэтам СНК аб Народным судзе была скасавана царская пракуратура, замест якой з'явіўся інстытут грамадскага абвінавачвання, дзе абвінаваўца меў права ўступаць у справу з моманту, калі следчы пачынаў справу, і кожны грамадзянін мог выступіць у якасці абвінаваўцы, але пры наяўнасці грамадзянскіх правоў [4].

Калі паўстала пытанне арганізацыі грамадскага абвінавачвання на месцах, нарком юстыцыі РСФСРІ. З. Штэйнберг у снежні 1917 г. выдаў інструкцыю, дзе ўдакладніў, што пры Рэвалюцыйным Трыбунале як для абвінавачвання, так і для абароны павінна быць створана калегія правазаступнікаў, якая складалася з грамадзян, што добраахвотна жадаюць дапамагчы рэвалюцыйнаму правасуддзю шляхам вольнага запісу ў такія калегіі па рэкамендацыі Саветаў. Са складу такой калегіі Рэвалюцыйны Трыбунал для кожнай справы мог запрасіць грамадскага абвінаваўцу і абаронцу. Захоўвалася і права аднаго з гледачоў пасяджэння выступаць у судовых спрэчках у якасці абвінаваўцы..

Другі дэкрэт аб судзе 1918 г. звузіў права «ўсіх» быць абвінаваўцам на судзе. Замест гэтага пры Саветах працоўных салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў засноўваліся асобныя калегіі асоб, што прысвячалі сябе правазаступніцтву як у форме грамадскага абвінавачвання, так і ў форме грамадскай абароны з правам уваходжання ў такія калегіі асоб, выбіраемых і адклікаемых Саветамі. Але пэўнае адценне дэмакратызму заканадаўца захаваў, дазваляючы ў судовых спрэчках нароўні з абвінаваўцам з калегіі браць слова для абвінавачвання адной з асоб, што прысутнічалі на пасяджэннях, так званай асобе «з публікі» [5].

Паводле дэкрэта СНК ад 4 мая 1918 г. пры кожным Рэвалюцыйным Трыбунале адначасова са следчай камісіяй павінна была існаваць калегія абвінаваўцаў у складзе не менш за трох асоб, якія выбіраліся мясцовымі Саветамі дэпутатаў непасрэдна ці па рэкамендацыі Рэвалюцыйных Трыбуналаў або Наркамата юстыцыі.У абавязкі гэтай калегіі ўваходзілі: прадстаўніцтва хоць аднаго з членаў калегіі на пасяджэннях следчай камісіі пры разглядзе пытання аб перадачы Трыбуналу ўсіх асоб, адносна якіх заведзена справа ў Рэвалюцыйным Трыбунале; выдача заключэння па пытаннях аб падсуднасці спраў і паўнаце зробленага следства; прапановы следчай камісіі завесці абвінавачванне за злачынства, прадугледжанае палажэннем аб Рэвалюцыйных Трыбуналах ці якое ўтрымлівае ў сваім складзе прыкметы контррэвалюцыйнага дзеяння; фармуляванне абвінаваўчых тэзісаў і публічнае абвінавачванне па ўсіх справах на судовых пасяджэннях Рэвалюцыйнага Трыбунала. Пры Рэвалюцыйным Трыбунале УЦВК таксама стваралася калегія абвінаваўцаў, адной з задач якой было аб'яднанне і кіраўніцтва калегіямі пры мясцовых трыбуналах.Па сутнасці тут мы бачым замену вольнага

грамадскага абвінавачвання на вызначаны шэраг пастаянных супрацоўнікаў, якія ўжо і былі, па сутнасці, судовымі пракурорамі, хоць яны гэткай назвы і не насілі [3].

Паводле дэкрэта УЦВК ад 30 лістапада 1918 г.«Аб народным судзе РСФСР», Калегіі абаронцаў, абвінаваўцаў і прадстаўнікоў бакоў у грамадзянскім працэсе засноўваліся пры павятовых і губернскіх Выканкамах Саветаў для садзейнічання суду ў справе найбольш поўнага асвятлення ўсіх абставін справы. Члены такіх калегій выбіраліся выканкамамі Саветаў на агульных з усімі астатнімі службовымі асобамі падставах зшэрагу асобаў, якія адпавядалі патрабаванням да грамадзян, што мелі права выбіраць і быць выбранымі (на падставе арт. 64 Канстытуцыі РСФСР 1918 г.). Такія асобы лічыліся службовымі і суадносна з гэтым атрымлівалі аклад таксама як і народныя суддзі. Падчас судовых сесій яны адкамандзіроўваліся ў народны суд у колькасці, якія той устанаўліваў, а для ўдзелу ў працэсе персанальна прызначаліся судом з ліку прыкамандзіраваных[2].

Згодна з новай пастановай УЦВК ад 21 кастрычніка 1920 г. абвінаваўцы былі ўжо пры аддзелах Юстыцыі і прызначаліся губернскімі выканкамамі Саветаў па прадстаўленні аддзелаў юстыцыі. Дзеля прызначэння на пасаду кандыдат павінен быў мець права выбіраць і быць выбраным у Саветы дэпутатаў, мець палітычны вопыт працы ў пралетарскіх арганізацыях, партыі, прафсаюзах, кааператывах, фабрычна-завадскіх камітэтах і савецкіх установах і мець тэарэтычную ці практычную падрыхтоўку для пасады народнага суддзі.Таксама права выступаць у якасці абвінаваўцы ў Народным судзе мелі ўстановы і прафесійныя арганізацыі, якія завялі справу, у асобе сваіх прадстаўнікоў [6].

У 1922 г. адбыліся значныя змены, якія былі звязаны з усталяваннем інстытута пракуратуры, пасля чагозамест функцыі замены судовага пракурора грамадскае абвінавачванне стала выконваць толькі дадатковую ролю. У пачатку свайго існавання пракуратура не магла забяспечыць абвінаваўцаў для ўсіх судовых пасяджэнняў, таму дапаможны рэзерв прадугледжваўся КПК РСФСР 1922 года (арт. 54) іКПК БССР 1923 года (арт. 50). У якасці абвінаваўцы маглі прымаць удзел пракуроры, а таксама пацярпелыя па справах прыватнага абвінавачвання, прадугледжаных 10 артыкулам КПК РСФСР 1922 года і 10 артыкулам КПК БССР 1923 года, упаўнаважаныя прафсаюзаў і іх аб’яднанняў, прадстаўнікі сялянскіх грамадстваў узаемадапамогі і іншых грамадскіх арганізацый пралетарыяту і працоўнага сялянства па справах іх удзельнікаў, прадстаўнікі Інспекцыі Працы і іншых інспекцый па справах, што адносіліся да іх кампетэнцыі[8].

Хоць існаванне грамадскіх абвінаваўцаў і было фармальна прадугледжана заканадаўствам да яго аднаўлення, але, на практыцы, пачынаючы з 1922 па 1935 гг., ведамаснымі актамі пракуратуры яны былі цалкам падначалены пракурорам, і грамадскае абвінавачванне паступова пераўтварылася ў дзяржаўнае, і знікла ў 1937 г. Навукоўцы вылучаюць некалькі прычын знікнення інстытута грамадскага абвінавачвання: адсутнасць у СССР антаганізму паміж дзяржавай і грамадствам, узмацненне ролі пракуратуры; адзяржаўленне грамадскага абвінавачвання і ўплыў культу асобы Сталіна на ўсю дзяржаўную і грамадскую сферу жыцця краіны, у выніку чаго грамадства было адхілена ад кіравання краінай [9, с. 10].

Такім чынам, і ў момант самастойнага існавання, і ў момант стварэння органаў пракуратуры інстытут грамадскага абвінавачвання адыгрываў вельмі важную ролю. Ён з'яўляўсясвоеасаблівым мастом паміж грамадствам і дзяржавай, а потым і дзяржаўнага органа нагляду, падымаючы іх прэстыж і аўтарытэт у вачах грамадства, з'яўляючыся свайго роду доказам сумленнасці іх працы і прамым прынцыпам рэалізацыі ленінскай канцэпцыі сацыялістычнага грамадства, дзе пралетарыі, беручы судовую ўладу ў свае рукі, здзяйснялі кіраванне краінай.

**Библиографические ссылки:**


1. *Мартинович И. И.* Избранные труды. Минск : Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2016.
2. О Народном суде Российской Социалистической Федеративной Советской Республики (положение) [Электронный ресурс] : Декрет Всероссийского центрального исполнительного комитета от 30 ноября 1918 года// КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «Консультант Плюс». – М., 2020.
3. О революционных трибуналах[Электронный ресурс] : Декрет Совета Народных Комиссаров от 4 мая 1918 года// КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «Консультант Плюс». – М., 2020.
4. О суде [Электронный ресурс] : Декрет Совета Народных Комиссаров РСФСР от 24 ноября 1917 года// КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «Консультант Плюс». – М., 2020.
5. О суде [Электронный ресурс] : Декрет Всероссийского центрального исполнительного комитета от 7 марта 1918 года № 2// КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «Консультант Плюс». – М., 2020.
6. Положение о Народном суде Российской Социалистической Федеративной Республики [Электронный ресурс]: Декрет Всероссийского Центрального Исполнительного Комитета от 21 октября 1920 года// КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «Консультант Плюс». – М., 2020.
7. *Полянский Н. Н.* Общественное обвинение в советском законодательстве// Социалистическая законность. 1937. № 11. С. 57-66.
8. Уголовно-процессуальный кодекс БССР от 15 апреля 1923 г. [Электронный ресурс] // Pravo.by Нац. центр правовой информации Республики Беларусь. – Режим

доступа: http://pravo.by/pravovaya-informatsiya/normativnye-dokumenty/kodeksy-respubliki-belarus/. – Дата доступа: 18.04.2020.
9. *Якимов П. П.* Проблемы общественного обвинения и защиты в советском уголовном процессе : автореферат диссертации на соискание учёной степени доктора юридических наук : 12.715. Свердловский юридический институт. Свердловск, 1971.